Pierasyłka apłačana ryčałtam.

Nr. 32 (625). Wilnia, Čaćwier 5 Wieraśnia 1935 h. Hod XI (XIX).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

ПАСТАНОВЫ КАМІНТЭРНУ І БЕЛАРУСЫ

У другой палове жніўня сёл. скончыўся ў Маскве 7-мы Кангрэс камуністычнай міжнароднай арганізацыі Камінтэрну. Як і папярэднія, так і сёлетні кангрэс быў многалюдны, працавіты і цікавы. Кангрэс гэты, на якім былі камуністы дэлегаты бадай з усіх дзяржаў сьвету, прыняў пастановы, што гавораць аб найбліжэйшых плянах, мэтах і тактыцы камуністаў у іх працы і барацьбе на ўсім сьвеце.

Нас тут прадусім цікавяць пастановы, якія цьвердзяць, што камуністы павінны ўсюды лучыцца з нацыянальнымі, дэмакратычнымі і лібэральнымі арганізацыямі, каб аслабляць іх некамуністычны характар, браць іх пад сваю апеку і супольным фронтам бароцца проціў фашызму, заводзячы ўрэшце камунізм ня толькі ў Эўропе, але так жа і на ўсім сьвеце.

Праўда, спробы такога супольнага фронту камуністы рабілі і даўней. Так напр. летась з гэтым самым зварочваліся яны да ППС, Бунду і інш. Тыя прапазыцыю камуністаў зразумелі, як імкненьне падпарадкаваць іх камунізму і яе адкланілі. Але калі камуністы рабілі гэткія заходы даўней, дык што-ж гаварыць цяпер, пасьля пастановаў іх найвышэйшай улады, калі супольны фронт іх з некамуністамі стаўся для іх законам!

І сапраўды, на выконваньне загадаў Камінтэрну доўга чакаць ня прыйшлося. Супольны фронт камуністаў і соцыялістаў у Францыі, створаны яшчэ раней, пад уплывам апошняга Кангрэсу Камінтэрну стаўся фактам ня толькі ў тэорыі, але й у практыцы, доказам чаго — нядаўнешнія крывавыя камуністычна-соцыялістычныя выступленьні ў некаторых мясцох Францыі. Характарам сваім, зьместам і мэтамі выступленьні гэтыя — камуністычныя. Супольнасьць там фронту выявілася ў тым, што францускія сацыялісты, страціўшы сваё асобнае аблічча, падпарадкаваліся камуністам.

Нядоўга чакалі камуністы на выконваньне пастаноў Камінтэрну і адносна беларускіх нацыянальных дэмакратычных, як палітычных, так і культурных арганізацыяў у Зах. Беларусі. Аказваецца, што прапановы гэным беларускім арганізацыям і іх сябром аб супольным фронце камуністы ўжо зрабілі. Праўда, час на гэта падхадзячы, падатлівы. Выбары ў польскі сойм, беларускае жыцьцё пад Польшчай наагул, а так-жа нядвузначнае насяданьне гітлерызму на ўсходнюю Эўропу — усё гэта разам узятае падобнаму аб'яднаньню спрыяе як ня трэба лепш.

Справа гэта аднак настолькі паважная, што паводле настрою, сэнтымэнту, паводле пачуцьця набалелай душы судзіць яе нашы арганізацыі не павінны. Падыход наш да гэтай справы павінен мець пэрспэктыву прынцыповую і гістарычную. Праўда, камуністы сяньня заклікаюць нацыянальныя і дэмакратычныя арганізацыі да супольнай барацьбы проціў фашызму і зьвярынага нацыяналізму ў некаторых дзяржавах Зах. Эўропы, але забываюцца аб чырвонай дыктатуры, аб людзкой няволі і нядолі, якая пануе на Усх. Эўропы і Азіі — ў СССР, дзе ня толькі народы, але й паасобныя грамадзяне ня маюць належных грамадзкіх і асабістых правоў. Беларусы нацыянальнага і дэмакратычнага кірунку павінны зразумець, што пры сяньняшніх адносінах камуністаў да беларускага народу ў БССР, і пры сучасным беларускім палітычным палажэньні ў Зах. Беларусі, супольны з імі фронт, апрача далейшага закрапленьня нявольніцкага палажэньня бел. народу там на нашым усходзе і пашкоджаньня беларускаму нацыянальнаму жыцьцю тут, ня дасьць нічога. Беларусы гэтага кірунку павінны так адносіцца да камуністаў, каб не паўтарылася з імі тое, што было з Радай Бел. Народнай Рэспублікі і з Сял.-Раб. Грамадой.

Аднак, як сказана вышэй, камуністы намаўляюць беларусаў да супольнага фронту. Якжа аднесьціся да гэтага канкрэтнага факту? Вось-жа немагчыма гаварыць аб супольным фронце між кірункамі грамадзкай і палітычнай думкі, якія ідэолёгічна і практычна між сабой ня маюць нічога супольнага. Такім чынам, прад' тым, як гаварыць аб супольным фронце працы, трэба было-б гаварыць аб супольнай ідэолёгічнай плятформе, на якой гэтыя праціўныя кірункі маглі-б сыйсьціся.

Дзеля гэтага камуністы павінны: выказацца проціў усякай дыктатуры, а знача і чырвонай, прызнаць правы на бел. нацыянальную культуру, ня толькі формай, але і зьместам, выказацца проціў прымусовай колектывізацыі сялянскіх гаспадарак, а так-жа прызнаць права свабоды палітычнай, грамадзкай, рэлігійнай.

Ведама, камуністы могуць нам адказаць, што дарэмна мы ломімся ў адчыненыя дзьверы, бо гэта ўсё яны прызнаюць і гэта ўсё нават цьвіце ў СССР. Пэўне-ж, гаварыць можна і гэтак, але факты гавораць штосьці іншае. Вось-жа пакуль беларусы ня ўбачаць зьмены камуністычнай палітыкі ў успомненым кірунку, датуль гутаркі аб супольным фронце з камуністамі немагчымы.

Мэліорацыя і колёнізацыя Палесься

Палесьсе — гэта вялізарны абшар зямлі, які ляжыць абапал ракі Прыпяці, у даплывах рэк Нёману і Бугу; з усходу ад ракі Дняпра, на заходзе — да ракі Буг. Гэты абшар мае 100.000 кв. кілямэтраў і ёсьць большы за Латвію і за Бэльгію. Праз Палесьсе праходзіць этнографічная граніца Украіны з Беларусяй; на Палесьсі з украінскага боку жывуць — украінскія паляшукі, а з беларускага боку беларусы — беларускія паляшукі. Насяленьне там рэдкае.

Праз Палесьсе - ўпоперак, праз этнографічна украінскае і беларускае, — праходзіць цяперашняя палітычная граніца Польшчы з Саветамі. Палавіна Палесься знаходзіцца пад Саветамі, а другая палавіна становіць сёмую частку тэрыторыі сучаснай польскай дзяржавы.

Гэтая часьць Палесься, што пад Польшчай, палітычна-адміністрацыйна абнята ўладай Палескага ваяводзтва з сталіцай у Берасьці, дзе ўладу цяпер мае ад польскага ўраду, як ваявода, ведамы палкоўнік Костэк-Бярнацкі.

Палесьсе агулам — гэта нізіна; у часьці, што пад Польшчай, — шмат балота, многа прыродных мачулаў і падмокліны, — якіх са 2 мільёны гэктараў; траціна ўсяго абшару пакрыта лесам, але таксама падмоклым.

Словам, вялікі абшар зямлі, але мокры і трэба яго асушываць.

Асушываць Палесьсе пачалі ў XVIII стагодзьдзі — канал Агінскага; у XIX стаг. так-жа капалі каналы. Маскоўскія ўлады ня дбалі аб Палесьсі — належна не асушывалі і ніякай гаспадарчай культуры туды не заводзілі. Мусіць маскалі ўважалі, што рускі поп з верным цару паліцэйскім урадьнікам усяму дадуць раду. Але поп з урадьнікам аб мэліорацыі ня мелі паняцьця і на адводныя каналы ніякай увагі не зьвярталі, дык яны заплылі і цяпер трэба там аснаўной перабудовы.

Польскія ўлады, пасьля ўлучэньня палавіны Палесься ў сваю тэрыторыю, зрабілі вялікія пляны асушкі і загаспадараваньня на гэтых абшарах. Рэалізацыя гэтых плянаў пачалася ў 1928 годзе. Сьпярша пачалі асушываць палескія балоты. Праведзена камасацыя сялянскіх гаспадарак (бяз прырэзкі зямлі) і вызначаны месцы капаньня адводных равоў; вызначаны так-жа месцы аснаўных каналаў. Гэтак палескія балоты пакрыты маюць быць густой сеткай адводных равоў і даўзёрнымі аснаўнымі каналамі. Гэта работа вельмі каштоўная і на гэта трэба многа грошай. Дзеля гэтага і вялікі плян рэалізуецца зусім памалу.

Ад 1928 да 31 году мэліорацыя Палесься праводзілася выключна коштам дзяржаўнага скарбу, дык і работа была толькі пачата; за апошнія — 1932 і 33 — гады ў справе палескай мэліорацыі ніхто й пальцам аб палец ня ўдарыў. У 1934 годзе, калі быў створаны Фонд Працы, як дзяржаўны фонд, і калі „запрасілі" да гэтай работы ў супрацоўніцтва самаўрад з шарваркамі — праца каля асушкі Палесься ўзварухнулася.

Асушка Палесься цяпер праводзіцца адразу ў пяцёх мясцох: у Кобрынскім, Пружанскім, Драгічынскім, Кашырскім і Косаўскім паветах.

Мы бачым, што і ў этнографічна беларусхай частцы Палесься праводзіцца мэліорацыя, дзе асушацца вялікія прасторы і гэтак мае прыбыць добрай і ўраджайнай зямлі малазямельнаму і беззямельнаму сялянству.

Ага, прыбудзе зямлі!.. прыбывае й цяпер.. але ня ўсім!

Гэты вялікі плян асушкі Палесься мае ў сабе і другі плян, галоўны, які зрадзіў і сам плян мэліорацыі гэтай этнографічна беларуска-украінскай краіны, — гэта плян польскай там колёнізацыі.

У выніку дасюлешняй мэліорацыйнай працы ў Косаўшчыне асушана 1.891 гэктар зямлі, якая можа радзіць усялякае збожжа. Незважаючы, што кругом беларускія паляшукі душацца ў цеснаце на дробных гаспадарачках і сквапна паглядаюць на новую зямлю, на асушанай плошчы пасаджана 94 сям'і колёністаў з каранной этнографічнай Польшчы.

Кошты выкананьня гэтага пляну мэліорацыі пакрываюцца гэтак: 40 прац. дзяржаўны скарб, 40 прац. самаўрады, а 20 прац. мясцовае насельніцтва, галоўна шарваркам. Такім чынам дабываецца гэтая зямля коштам усяе дзяржавы на палавіну з самаўрадамі пры вялікай дапамозе мясцовага насяленьня.

Паводле падлічэньня агульны кошт асушкі Палесься, з рэгуляцыйнымі работамі і будовай правільных водных шляхоў, вымагае 250 мільёнаў зл. З гэтага на мэліорацыю поля прыпадае 130 мільёнаў зл.

У цяперашнія часы Палесьсе ня можа вытрымаць гэткага цяжару, — каб вымагалі-б ад адных мясцовых самаўрадаў і насяленьня пакрыцьця гэтых коштаў. Туды патрэбна дапамога, але і ўсюды цяпер цяжка і ўсюды чакаюць гэтай дапамогі. Дзеля гэтага і ўся акцыя асушкі праводзіцца куды вальней ад акцыі колёнізацыйнай на асушанай плошчы.

„Дабрадзейства" мэліорацыі Палесься, аб якім надта многа пішуць многія польскія газэты, беларускім і украінскім паляшуком ведамае, а дзеля гэтага і ня ўсюды гэта мэліорацыя мясцовым насельніцтвам пажаданая. Падмога для мэліорацыі на Палесьсі даецца туды, дзе вымагае гэтага патрэба колёнізацыйная, — там, дзе можна пасадзіць польскіх асаднікаў. Там, дзе гэткай карысьці для колёнізацыі няма, — гэта падмога сапраўдны „сірочы блін" і праводзіцца работа, агульнага значэньня асушкі.

Словам, адначасна з мэліорацыяй праводзіцца на Палесьсі і польская колёнізацыя.

п—к.

Chto winawaty?

Ludzi ŭ swaim žyćci zaŭsiody starajucca mieć sabie maralnuju aporu. Najbolš-ža takoj apory patrabujuć tady, kali pieražywajuć niaščaście, niadolu, biadu, ci jakija-niebudź strašnyja padziei.

Kali hawaryć ab Biełaruskim Narodzie, ab jahonym sučasnym žyćci, dyk treba śćwierdzić, što pieražywaje jon adzin moža z najbolš ciažkich peryjadaŭ. — Čamu? — Tamu, što jon užo świedamy, — jon čuje, jon wiedaje, što jamu należycca i čamu jon taho, što jamu należycca, nia moža mieć. Dziela hetaha šukaje niejkaje wyšejšaje siły, — siły, jakaja-b jamu pamahła ŭ žyćciowym zmahańni. Hetaje-ž šukańnie dawodzie časta da taho, što ludzi hublajuć swaju wieru ŭ Boha, a pieradusim pryčyniłasia da razmnažeńnia roznych relihijnych sektaŭ, jak tut u Zach. Biełarusi, tak i ŭ BSSR, katoryja z kožnym dniom raźwiwajucca i razrastajucca.

U Zach. Biełarusi majem užo nia tolki metadystaŭ, baptystaŭ, ale i štundystaŭ, i adwentystaŭ, i sijanistaŭ, i daśledčykaŭ św. Piśma, i siomušnikaŭ („zielono-świętkowcy"), i subotnikaŭ, i skakunoŭ i trasunoŭ i chto wiedaje jšče jakich. Wieru swaju apirajuć jany byccam na światym Piśmie. Ichnyja sposaby malitwy prypaminajuć časta niejkija dzikija pahanskija abrady, u časie katorych sialanie časta ŭpadajuć u ekstazu, zabywajuć swaju mowu, kryčać niawiedama što i pa jakomu, uzywajučy niejkaha ałaja!...

Woś-ža paŭstaje pytańnie, čamu naš narod nia šukaje sabie maralnaj apory, padtrymańnia ŭ Carkwie abo ŭ Kaściele, čamu jon kidaje swaju dasiulešniuju relihiju i šukaje nowaj?

Čamu ŭ nas niama taho, što jość u Francyi, dzie pad naciskam masonskich łožaŭ bačym pawarot da chryścijanstwa, da Kaścioła, abo jznoŭ u Niamieččynie, dzie pad naciskam hitleryzmu Kaścioł adradžajecca, zdabywajučy što-raz bolš wiernych?

Čamu, adnym słowam, u nas sektanstwa pašyrajecca?

Na hetaje pytańnie prabuje da peŭnaj miery adkazać wilenskaja rasiejskaja hazeta „Русское Слово", jakaja jość blizkaj da prawasłaŭnych duchoŭnych uładaŭ. U № 199 z dn. 25.VII. siol., padajučy wiestku ab raźwićci sektanstwa ŭ Świancianskim pawiecie, „Рус. Слово" piša: „što „prapawiedniki" (sektanstwa — *j. n.)* majuć posłuch nia dziela taho, što jany „niasuć u świet nowuju nawuku", a dziela taho, što razdźmuchiwajuć niezadawaleńnie nasielnictwa, wyklikanaje pastupkami duchoŭnych pastyraŭ u miascowych katalickich parachwijach, dzie katalicki ksiondz ustanawiŭ wielmi wysokuju płatu za chrost, pachowiny, ślub i inš. relihijnyja pasłuhi. Pastyry hetyja nia jduć na ŭstupki, nawat i ŭ takich wypadkach, kali parachwijanin pa biednaści prymušany adkazacca ad hetych pasłuhaŭ. U mnohich sialan jość darosłyja dzieci, katoryja da hetaj pary nia chryščany. Za ślub, zwyčajna, patrabujuć ad parachwijan ad 50 da 100 zł."

Uznoŭ-ža katalicki ksiondz dziekan Śnieżko z Wilejki zajawiŭ supracoŭniku wilenskaje polskaje hazety „Słowo" (№ 234 z dn. 27.VIII. siol.), katory šyroka pisaŭ ab sektantach, što sektanty, pamiž inšym, karystajucca posłucham z pryčyny „niezadawaleńnia siarod prawasłaŭnych, wyklikanaha wysokimi koštami duchoŭnych usłuhaŭ sa starany świaščeńnikaŭ..."

Woś i zrazumiej i raźbiary, chto winawaty?..

Na naš pahlad, dyk aboje raboje. I polskija ksiandzy i ruskija świaščeńniki adnolkawyja majuć zasłuhi(!) ŭ pašyrańni sektanstwa.

Pamyłkaj adnak było-b uważać, što tolki wysokija płaty za duchoŭnyja pasłuhi adbiwajuć narod ad carkwy i kaścioła. Tut jość pryčyny i krychu hłybiejšyja.

Pierad usim takoj pryčynaj ahulnaj jość toje, što Katalicki Kaścioł i Prawasłaŭnaja Carkwa niasuć Chrystowuju nawuku ŭ całaj jaje paŭnacie, jakuju ciažej zrazumieć i wypaŭniać, čymsia častku jakuju-biebudź maleńkuju, skryŭlenuju, katoruju niasuć sekty.

Kali-ž brać iznoŭ specyjalna abstawiny biełaruskija i z punktu hledžańnia nacyjanalna - biełaruskaha, dyk Kaścioł i Carkwa ŭ našym krai źjaŭlajucca dla narodu čužymi, — bo ŭ cerkwach panuje čužy duch rasiejščyny, a ŭ kaściołach taki-ž duch polščyny, a tak-ža dziela taho, što duchoŭniki nawučajuć narod u niezrazumiełaj jamu mowie rasiejskaj, abo polskaj.

Aproč hetaha, sektanstwa pašyrajecca ŭ našym kraju i dziela taho, što duchoŭniki prawasłaŭnyja i katalickija stajać daloka ad narodnych masaŭ, što jany pierawažna bolš zajmajucca sprawami asabistymi, čymsia relihijnymi.

I biazumoŭna, kali tak budzie dalej, kali Kaścioł i Carkwa buduć išći naprociŭ narodnych imknieńniaŭ biełaruskaha narodu, kali narod i nadalej budzie pazbaŭleny rodnaj mowy ŭ światyniach, kali jamu duchoŭnyja pasłuhi buduć niedastupnyja, i kali słowam: Kaścioł i Carkwa, a tak-ža i duchoŭniki nia stanucca tym, čym jany pawinny być, to sekty buduć uściaž pašyracca. Bo taki radaškaŭski, ci wilejski sektant Niadźwiedzki abo Minajło — rodam sialanie — mahčymuć chutčej prahawaryć da swaich susiedziaŭ tak-ža sialan. Dy jany, sektanty, užo daŭno padumali ab tym, kab wydać św. Pisańnie pa biełarusku i wydali jaho. A što-ž prawasłaŭnyja duchoŭniki ab hetym dumajuć? Što sabie dumajuć katalickija duchoŭnyja ŭłady, jakija trymajuć pa 3 hady biełaruskija relihijnyja knižki ŭ cenzury, abo kali wysyłajuć ksiandzoŭ biełarusaŭ z biełaruskich parachwijaŭ u polskija, tady, kali hetyja ksiandzy stajać blizka narodu, da jaho mohuć prahawaryć i siarod jaho mohuć mieć šyroki posłuch? Što ŭreščie sabie dumajuć prawasłaŭnyja duchoŭnyja ŭłady, jakija taksama nie dajuć prychodaŭ biełaruskim świaščeńnikam na biełaruskich ziemlach?!

Jany ŭsio peŭna dumajuć takim sposabam zatrymać biełaruski adradženski ruch, nia hledziačy, što hetym-ža samym škodziać u našym kraju Katalictwu i Prawasłaŭju, i za heta spadaje na ich usia adkaznaść. Biełaruski-ž adradženski ruch pojdzie dalej niepieramožna swaim šlacham.

j. n.

А. Пінчук

Сучаснае палажэньне беларускай вёскі

XI. Вясковае рамясло.

Беларуская вёска церпіць голад беззямельля, які з кожным годам прыймае больш пагражаючыя разьмеры.

У сувязі з крызысам у прамысловасьці спыніліся ўсякія магчымасьці эміграцыі ў іншыя краі — на вёсцы засталася амаль адзіная магчымасьць заработку — гэта **хатняе** рамясло.

Беззямельная і беспрацоўная частка вясковых людзей узялася за розныя вырабы.

Зьявіліся ў вёсках добрыя кавалі, сталяры, цесьлі і інш.; людзі навучыліся вырабляць ня толькі кошыкі і дзераўляныя лыжкі, але майструюць прыгожую мэбель, вульлі для пчолаў і іншыя патрэбныя ў гаспадарцы прылады.

Здавалася, што хоць гэтакім спосабам можна будзе знайсьці сабе і сям'і хлеб, каб існаваць. Праўда, гэтакія вырабы прадаюцца на рынку літаральна за грашы, аднак і грош у сучасным палажэньні мае ў вёсцы аграмаднае значэньне. Хутка, аднак, беспрацоўная вёска „згубіла" і гэтую магчымасьць заработкаў.

Адміністрацыйныя ўлады пачалі вымагаць гэтак зв. „Karty Rzemieślniczej" ня толькі ад тых, што спэцыяльна займаюцца рамяслом, але нават і ад тых, каторыя нешта робяць для сябе, або для суседа.

У выніку гэтага, паліцыя пачала сьпісваць пратаколы, а паветавыя стараствы пачалі караць рамесьнікаў за рамесленую працу без „Karty Rzemieślniczej".

Такім чынам беспрацоўе ў вёсках завастраецца йшчэ больш і людзі пападаюць у бязвыхаднае палажэньне.

Трэба ведаць, што гэту „Kartu Rzemieślniczu« дастаць ня лёгка, бо ў апошнія часы вымаганьні ад рамесьнікаў значна павялічыліся. Гэтак, напрыклад, вымагаюць ад іх экзамінаў і нават, як выясьніла міністэрства, папярэдняя праца ў характары чалядніка без такога экзаміну ня мае ніякага значэньня.

Экзаміны трэба здаваць пры гэтак зв. „Izbach Rzemieślniczych" (аплаціўшы за іх 40 зл.) і наагул уся гэтая процэдура злучана з вялікімі коштамі і турботамі, якія для вясковых беспрацоўных сусім не па сіле.

Стварылася такое палажэньне, што моладзь дома ў вёсцы ня можа вучыцца рамясла, бо вясковыя рамесьнікі на навуку ня могуць браць.

Трэба йсьці ў горад да майстры, які мае ўсе правы, але той вымагае, звычайна, вялікай аплаты за навуку, а часьцей усяго наагул так-жа нікога не бярэць, бо павялічэньне колькасьці вучняў павялічвае падаткі і розныя іншыя налогі.

З гэтай прычыны вясковая моладзь ня толькі пазбаўлена працы ў сучасную хвіліну, але ня мае нават надзеі, што яна можа навучыцца нечага карыснага, што дало-б ёй кавалак хлеба ў будучыні.

Зразумела, што гэтакі стан рэчаў ня толькі пагоршыў палажэньне вясковых рамесьнікаў, але ён прычыняецца і да пагоршаньня палажэньня ўсяго сялянства наагул.

Справа ў тым, што ўсякага роду рамесьнікі, аб'яднаўшыся ў цэхі, падымаюць цэны за выкананьне розных працаў. Павялічваецца дабрабыт зарганізаванай невялічкай групы „кваліфікаваных" рамесьнікаў, але ён павялічваецца коштам сялянства, ня кажучы ўжо пра вясковых беспрацоўных, якія страцілі ў сувязі з гэтым рамесьнічым надзорам свой папярэдні кавалак хлеба.

Калі мы ўзглянем на агульнае палажэньне Беларусаў пад Польшчай, дык пабачым тут вельмі характэрнае зьявішча. Беларуская інтэлігенцыя сядзіць бяз працы і ня мае надзеі, каб яе ў цяперашнія часы мець; рамесьнікі пазбыліся сваіх варштатаў, бо ўтрымаць іх з прычыны розных „пшэпісув" аказалася немагчымым; гандаль поўнасьцю ў руках жыдоў, а Беларусам трудна да яго прыступіць нават у форме коопэрацыі.

Што-ж астаецца рабіць паўтраці мільённай масе народу?

Астаецца зямля і заводы з фабрыкамі.

Зьмля ў нашым Краю вялікімі абшарамі награмаджана ў дварох і фальварках, уласьнікамі якіх зьяўляюцца польскія паны або расейскія барыны, а беларуская сялянская маса сядзіць на вускіх ніўках у перапоўненых народам вёсках. На заводах і фабрыках дастаць працу немагчыма, бо ўсюды крызыс, усюды безрабоцьце.

Вось абраз жыцьця ў беларускай вёсцы.

Nawarot da dzikaści

U numary 4 „Новага Шляху" ja prypadkowa pračytaŭ nadrukawany tam artykuł pad zah. „Lawon". U hetym artykule prawodzicca pamiž inšym i dobraja dumka, što dawoli być biazdziejnym i słabawolnym, ale treba ŭziacca da rašučaj pracy na niwie narodnaj i hramadzkaj. Dumka biazumoŭna dobraja i jaje treba pašyrać u radoch našaj haradzkoj i wiaskowaj intelihiencyi, jakaja, užo nie haworačy ab narodnaj masie, nia wyznačajecca, ahułam, ani enerhijaj u swaim dziejańni, ani stanoŭkaściaj i wytrywałaściaj u swaich prakanańniach. Treba biełaruskim dziejačom na wioscy i ŭ horadzie bolej mahutnaha biełaruskaha duchu, bolej hartoŭnaje woli i bolš rašučaści ŭ dziejańni. Heta ŭsio ja znajšoŭ u artykule „Lawon" i z hetym całkom zhadžajusia.

Ale jość tam rečy, z katorymi ja nie mahu zhadzicca. Tam jość takija skazy, jakija waročajuć nas da starazakonnaha prawiła „woka za woka, a zub za zub", abo nawat da dzikaści prymityŭnych, niekulturnych narodaŭ. Tam pamiž inšym krytykujucca skazy Nowaha Zakonu ab niepraciŭleńni złomu i ab patrebie zhody z bližnim. („A chto-b ciabie prymušaŭ tysiača krokaŭ, idzi z im jašče raz stolki"; „kali chto tabie daść pa ščace — padstaŭ jamu druhuju" i h. d.). Tam znachodzim prykłady: lisicu, jakaja smašna jeła ptušku, złoŭlenuju spadciška ŭ kustoch; kamara, jaki smaktaŭ kroŭ; źmiaju, jakaja dušyła złoŭlenuju myšku — i pry hetym wywodzicca prawiła, što jak pasiarod żywioły niama litaści, taksama pawinna być pasiarod ludziej...

Woś tut „Nowy Šlach" zusim mylajecca, bo jon stawić žyćcio źwiaroŭ i ich krywažadnyja zwyčai ŭ prykład ludziam, a hetaha rabić nijak nia možna. Hetaha nie rabili sapraŭdy kulturnyja ludzi nikoli i nie pawinny rabić nawat ciapier, u XX stahodździ, kali źwiarynaja „etyka" prachodzić u etyku i zwyčai ludziej i kali zapanawała prawiła: „Maješ siłu, dyk biary j dušy". I ludzi, tak jak źwiary, dušać adny druhich. Prykładaŭ daloka šukać nia treba. Jany traplajucca ŭ žyćci ludziej asabistym, hramadzkim i mižnarodnym.

Hetaje dušeńnie słabiejšych my spatykajem nia tolki ŭ sučasnych nam padziejach, jano było i daŭniej. Jaho spatykajem u dzikich narodaŭ: tam z swaim woraham čaławiek abchodziŭsia zusim prosta: zabiwaŭ jaho, piok i jeŭ, zusim taksama, jak lisica ptušku, woŭk awiečku i źmiaja myšku. Ale razumnymi ludźmi hetaje prawiła było pryznana za niahodnaje dla ludzkoha hramadztwa i pačalisia reformy ŭ kirunku lepšych, bolej kulturnych prawił. Takim refarmataram ludzkoj dzikaści, jakaja prajaŭlałasia i ŭ St. Zakonie, byŭ Chrystos, jaki ŭ imia henych wyšejšych ideałaŭ pryjšoŭ zrefarmawać čaławiectwa. Adkidajučy starazakonnaje prawiła: „woka za woka, zub za zub, (jakoje, miž inšym kažučy, było dana Majsiejem dla narodnych sudździaŭ, jak praktyčnaje prawiła dla sudoŭnictwa, a jakoje žydy ŭwiali, jak ahulnaje prawiła dla ŭsich), woś-ža, adkidajučy hetaje prawiła, Chrystos padaŭ niekalki prykładaŭ, jak maje pastupać wyznawalnik Now. Zakonu. Kažu: *prykładaŭ*, bo *prawiła* ŭ chryścijanstwie jość takoje: "Lubiecie worahaŭ wašych, dabro čyniecie tym, katoryja nienawidziać was i maleciesia za tych, katoryja prašledujuc i černiać was, kab wy byli synami Ajca wašaha, katory jość u niebie".

Heta jość prawiła — i sapraŭdy wysokaje prawiła! Jano adrywaje čaławieka ad źwiarat, ad źwiarynaj i ludzkoj dzikaści, a padymaje da daskanalstwa Božaha! U imia hetaha prawiła pamior Chrystos i za hetym prawiłam iduć usie sapraŭdy kulturnyja ludzi, jakija chacieli-b wyšejšych form ludzkoha žyćcia. Pastupajučy pawodle hetaha prawiła, chryścijanin moža padstawić i druhuju ščaku, moža išći jašče tysiaču krokaŭ, moža addać swoj płašč, moža pajšci na jaki jašče wyšejšy ŭčynak samaachwiarnaści, kali heta budzie patrebnym dla ŭwiadzieńnia ŭ žyćcio ahulnaha prawiła chryścijanskaj lubowi, *ale heta buduć tolki prykłady*, ale nia prawiła dla ŭsich ludziej. U hetkim značeńni treba razumieć henyja słowy Chrysta.

Dyk zmahajučysia za prawy biełaruskaha narodu (adzinak i całaści), treba imknucca da ŭwiadzieńnia ŭ žyćcio nie źwiarynaje dzikaści, ale wyšejšych, bolej kulturnych form, jakija znajšli swoj wysłaŭ u nawucy Chrysta. Nie padabajucca „Nowamu Šlachu" prykłady, padadzienyja Chrystom? Nu što ž, možna pašukać inšych, ale imknucca da źwiarynaj dzikaści nijak nia možna. Choć-by dziela taho, što słabyja na hetym wyjduć najhoraj.

Daloki.

Бацькі Беларусы! Вучэце сваіх дзетак беларускае граматы!

Z wybarnaha frontu

U prošłym numary „B. Kr.“ my pisali ab zaciššy na „wybarnym froncie“ i ab padziejach na wybarnym panadworku — ab „wybarach“ kandydataŭ na pasłoŭ u Sojm. Pisali tak-ža ab bajkocie wybaraŭ u Sojm i Senat i wyjaśniali, čamu Biełarusy bajkatujuć hetyja wybary.

Biełaruskija sialanie na wybary nia jduć!

Z usich kutkoŭ našaj Krainy my atrymliwajem ad sialan piśmy, u jakich jany pišuć, što biełaruskija wiaskoŭcy na wybary nia jduć i ab hałasawańni słuchać nia chočuć. Adno z hetych piśmaŭ, dla charakterystyki wybarnych nastrojaŭ biełaruskaj wioski, dasłoŭna drukujem:

Наваградчына. Сяляне ў нашых ваколіцах ад выбараў адмаўляюцца і галасаваць ісьці ня хочуць. Вучыцялі з солтысамі зьбіраюць сходы сялян, на якіх агітатары нагаварываюць, каб ад выбараў не адракаліся і каб ішлі галасаваць. Гэтыя агітатары кажуць, што калі ў выбарным вокрузе не пададуць да поўнай лічбы 10.000 галасоў, то ў працягу 3 месяцаў міністр унутр. спраў вызначыць новыя выбары і будуць праводзіць іх на кошт тых воласьцяў, якія ўваходзяць у той вокруг. Такім чынам тыя воласьці будуць мець вялікія страты. *Сьцяпан Крушы.*

Ad redakcyi: My ŭžo pisali i wyjaśniali, što **prymusu hałasawać niama!** Za niehałasawańnie nijakaj kary tak-ža niama. Dyk nia može za niehałasawańnie karać i ministr. Pierawybary, pa zakonu, mohuć być, ale karać pierawybarami nichto nikoha nia maje prawa.

Rasiejcy ŭ Haliččynie ŭstrymliwajucca ad wybaraŭ.

„Р.Голос“ padaje, što rasiejcy Haliččyny ŭstrymliwajucca ad wybaraŭ i nia pojduć hałasawać. Takoje stanowišča wyklikana tym, što rasiejcy nia majuć nadziei prawiaści swaich pasłoŭ u Sojm z pryčyny ahulnych palityčnych abstawinaŭ i z uwahi na stanowišča tych ukraincaŭ, što jduć na wybary.

Wybary ŭ Senat.

Wybary ŭ Senat adbywajucca biaz učaścia sialan i rabotnikaŭ, jakija nia majuć wyšejšaj adukacyi abo asabistaj zasłuhi ŭ polskim haspadarstwie.

U Senat čaść pasłoŭ wybirajuć h. zw. wyšejšyja słai hramadzianstwa — intelihencyja i zasłužanyja, a častku pasłoŭ naznačyć prezydent.

Pieršy etap wybaraŭ u Senat adbyŭsia ŭ niadzielu 25 žniŭnia: byli wybary delehataŭ u wajawodzkija wybarnyja kalehii wybaraŭ kandydataŭ u Senat.

Hetyja delehaty — elektary 15 wieraśnia buduć wybirać kandydataŭ u senatary.

—o—

Hetak woś cicha, spakojna, biaz nijakaha aktyŭnaha ŭčaścia z boku šyrokich pracoŭnych — sialan i rabotnikaŭ, što abjadnanyja apazycyjnymi arhanizacyjami — prachodziać wybary ŭ Sojm i Senat. Hetyja masy starajucca tolki prajawić pasyŭnaść i hetym zademonstrawać swoj bajkot.

XI-ty Kanhres Eŭropejskich Nacyjanalnych Mienšaściaŭ i Biełarusy

Polskija ŭłady biełaruskamu pradstaŭniku nia dali pašpartu na wyjezd na Kanhres

Ad 2-ha da 4-ha wieraśnia siol. u Ženewie adbywaŭsia XI-ty Kanhres Eŭropejskich Nacyjanalnych Mienšaściaŭ. Biełarusaŭ ad samaha pačatku na hetych Kanhresach pradstaŭlaje Biełaruski Nacyjanalny Kamitet u Wilni.

Na paradku dnia sioletniaha Kanhresu byli miž inšym nastupnyja pytańni: Nacyjanalnyja mienšaści ŭ aŭtorytatyŭnych haspadarstwach, Hranicy panaddziaržaŭnaj hramadzkaści, Sposaby apracawańnia i abahulnieńnia abarony nacyjanalnych mienšaściaŭ, Rola stałaha mižnarodnaha sudu, Prawa da wolnaha ŭžywańnia nazowaŭ miascowaściaŭ...

Z uwahi na cikawiačyja biełarusaŭ pytańni pradbačanyja na siol. Kanhresie, Biełaruski Nacyjanalny Kamitet wynies pastanowu pryniać sioleta asabistaje ŭčaście na Kanhresie, delehujučy tudy siabru Prezydyumu Kamitetu inžyniera A. Klimowiča. Polskija ŭłady adnak biełaruskamu pradstaŭniku **nia dali pašpartu na wyjezd.** Dziela hetaha biełaruski delehat zmušany byŭ ahraničycca da wyjaśniajuča — prywitalnaj telehramy, a Prezydyjum B.N.K-tu wysłaŭ piśmienna na ruki hieneralnaha sekretara Kanhresu D-ra Ammende swajo stanowišča da razhladanych na Kanhresie pytańniaŭ.

Litoŭski Suświetny Kanhres

Ad niekatoraha času ŭ litoŭskich hazetach možna spatkać dumku ab patrebie ŭsielitoŭskaha suświetnaha kanhresu. Urešcie dumka hena stałasia čynam. Litoŭski Suświetny Kanhres adbyŭsia ŭ Koŭnie 11—17.VIII sioleta. Na Kanhres prybyło 3000 asob z 17 dziaržaŭ. Z hetych troch tysiač 100 byli ŭpoŭnawažnienyja delehaty. Kanhres prajšoŭ žywa i pładawita. Badaj kožny dzień da paŭdnia adbywalisia ahulnyja zasiadańni, na jakich byli referaty ab litoŭskaj emihracyi i ab sprawach ahulna-litoŭskich. Pa paŭdni pracawali asobnyja kamisii. Apračа hetaha adbywalisia asobnyja sabrańni žurnalistaŭ, studentaŭ, wučycialoŭ i inš. Pracaj Kanhresu žywa cikawiłasia hramadzianstwa ŭsiej Niezaležnaj Litwy, a prybyŭšyja z zahranicy litoŭcy emihranty cikawilisia tak-ža zroblenaj rabotaj i postupam swajej baćkaŭščyny. 17.VIII Kanhres skončyŭ swaju pracu. Apošniaje ahulnaje sabrańnie było praznačana dla dakładaŭ staršyniaŭ kamisijaŭ i razwažańniam pryhatawanych rezalucyjaŭ. Urešcie byli pryniaty rezalucyi: ahulnaja, u sprawie arhanizawańnia litoŭskaha suświetnaha sajuzu, u sprawie aświety i kultury i ŭ sprawie ekanamičnaj. Rezalucyi byli tak apracawany i ŭłožany, što faktyčna źjaŭlalisia prahramnymi punktami litoŭskaha suświetnaha sajuzu.

Nas tut najbolš cikawić arhanizacyjnaja rezalucyja. Woś jana.

„Pieršy litoŭski suświetny kanhres, wysoka ceniačy patrebu ścisłaj łučnaści i zhodnaha supracoŭnictwa litoŭcaŭ Litwy z litoŭcami emihrantami pastanaŭlaje stwaryć suświetny litoŭski sajuz i daručaje saboj wybranaj z dziesiacioch asob tymčasowaj uprawie pryhatawać prajekt statutu sajuzu, u asnowu jakoha pawinny być pałožany hetkija pryncypu: a) suświetny sajuz litoŭcaŭ składajecca z jurydyčnych asob (tawarystwaŭ, arhanizacyjaŭ i inšych), jak litoŭcaŭ Litwy, tak i zahraničnych, b) centr sajuzu ŭ stalicy Litwy, adnak usie bolšyja litoŭskija kalonii zahranicaj majuć swajho pradstaŭnika ŭ wykanaŭčych orhanach sajuzu“.

U tymčasowuju ŭprawu Sajuzu Kanhres wybraŭ dziesiać asob roznych palityčnych i hramadzkich kirunkaŭ.

Kanhres byŭ zakončany nacyjanalnym hymnam. Apošniaje słowa skazaŭ staršynia Kanhresu R. Skipitis, wyražajučy swaju radaść z adbytaha Kanhresu i padčorkwajučy ahramadnaje značeńnie dla dabra litoŭskaha narodu, jaho kultury i postupu.

P. Łuhanowič.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА

Культурна-прасьветная дзейнасьць гурткоў БІГіК. — Дня 19-га жніўня сёл. гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў в. Лядкох, Стаўпецкага пав., ладзіў беларускае прадстаўленьне, пасьля каторага былі дэклямаваны вершы Янкі Купалы.

Пры гэтым трэба адзначыць, што старшыня мясцовай пажарнай стражы (польскі асаднік) ня пусьціў у пажарніцкую залю прадстаўляць пабеларуску.

— Гурток БІГіК у в. Шальцінах у Браслаўскім пав. намагаўся зладзіць беларускае прадстаўленьне — прыгатаваліся прадстаўляць, прыбралі памешканьне, навучыліся дэклямаваць і пяяць, — але гурток не дастаў на гэта ўсё дазволу.

Сход сяброў гуртка БІГіК. Дня 30-га жніўня адбыўся агульны гадавы сход сяброў гуртка БІГіК у в. Шутавічах, Ашмянскага пав. Сход выслухаў справаздачу з дзейнасьці гуртка за мінулы год і выбраў новы ўрад гуртка ў складзе: Антось Жабінскі — старшыня, Уладзімер і Міхась Хлебовічы, Вінцук і Пётра Шутовічы сябры. Новаму ўраду жадаем плоднай працы!

Набажэнствы для беларусаў каталікоў у Вільні, па летніх вакацыях, пачнуцца ў касьцеле сьв. Мікалая ў нядзелю, дня 8-га верасьня — **а гадзіне 9-тай раніцы.**

Вучоныя БССР на міжнародных кангрэсах. Рад савецкіх вучоных БССР атрымалі запрашэньні прыняць удзел у надыходзячых міжнародных навуковых кангрэсах. У канцы жніўня выехаў у Будапэшт (Вугрыя) для удзелу ў працах 9 міжнароднага кангрэсу вэнэролёгаў — малады беларускі вучоны прафэсар Пракапчук.

Прафэсар Беларускага Мэдыцынскага Інстытуту Іргер прыйме ўдзел ў міжнародным Кангрэсе аб пераліваньню крыві, які склікаецца ў сярэдзіне верасьня ў Рым (Італія). Праф. Іргер выступіць з дакладам на тэму „Уплыў тэмпэратуры на стан сываратак і на кансэрваваную кроў“.

Выстаўка беларускага мастацтва Савецкай Беларусі ў Маскве. 6 жніўня ў выставачнай залі „Всекоопхудожник“ урачыста адкрылася выстаўка беларускага мастацтва Сав. Беларусі. На выстаўцы 150 работ— малярства, графікі, акварэлі, рысунку і 12 скульптур. На выстаўцы прадстаўлены творы мастакоў паміж іншымі В. Волка, Пэна, Ахрэмчыка, Пашкевіча, Даркевіча, Мініна, Кругера, Пэрыжазіста, Кудрэвіча, маладога мастака Беленіцкага, мастака самавучкі Навіцкага, а так-жа мастакоў скульптараў — Азгура, Грубэ і Бразэра.

9 жніўня адбыўся творчы вечар, прысьвечаны выстаўцы беларускага мастацтва, на якім з дакладам аб беларускім выяўленчым мастацтве выступаў Бескін.

Да справы беларускага адрыўнога календара. Беларускі адрыўны календар на 1936 г. ужо хутка выйдзе з друку. Зьмяшчае ён цікавы матар'ял з беларусазнаўства — з літаратуры, гісторыі, грамадзкага жыцьця, адраджэнскага беларускага руху; падае шмат гаспадарскіх навінаў і парадаў. Заказы ўжо прыймаюць беларускія кнігарні ў Вільні: „Пагоня“, Ст. Станкевіча і Ул. Манкевіча.

З САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Ураджай яблык і груш у БССР. Сёлета ўраджай садовіны ў Савецкай Беларусі значна большы, як летась. Асабліва вялікі ўраджай у цэнтральных і паўночных раёнах. З усей БССР сёлета мяркуецца атрымаць 110 тысяч тон яблык і груш. У мінулым годзе было сабрана каля 80 тыс. тон.

Z żałobnaje karty.

Ś. P. Konstancyja Strenkoŭskaja, rodnaja siastra biełaruskaha piśmieńnika 90-tych hadoŭ minułaha stahodździa, Adama Hurynowiča, paśla ciažkaj i doŭhatrywałaj chwaroby pamiorła na 64 hodzie žyćcia 21-ha lipnia sioleta ŭ swaim dwary Kawaloch, Pastaŭskaha paw., i tam pachawana. Niabožčyca nie stajała daloka ad biełaruskaha adradženskaha ruchu. Razumiejučy patrebu aświety ŭ rodnaj mowie dla Biełarusaŭ — hetaha asnaŭnoha dziejnika žyćcia i raźwićcia narodu, —u časie Siaredniaj Litwy załažyła ŭ swaim dwary biełaruskuju školu; dla patreb škoły sama jeździła ŭ Wilniu pa biełaruskija padručniki. Škoła, praŭda, koratka isnawała — była zakryta z niezaležnych ad zakładčycy pryčyn.

Pakinuła ŭ tych, chto znaŭ Niabožčycu, pamiać ščyraj, dobraj, wialikaha serca žančyny i pracaŭnicy.

Čeść Jejnaj Pamiaci!

Pahroza wajny i Liha Narodaŭ

Ciapierašniaje mižnarodnaje pałažeńnie zusim prypaminaje 1914 hod, u jakim pačałasia wialikaja suświetnaja wajna, što paradziła wialikija pieramieny ŭ świecie i źmianiła palityčnuju kartu Eŭropy.

Sapraŭdy adusiul pachnie porach!

Italija z Abisynijaj, zdajecca, wajawać buduć, bo nijakija zachady nie paŭstrymliwajuć italjanskaha fašyzmu ad namieraŭ zachapleńnia Abisynii. U hetym wypadku treba spadziawacca, što Niamieččyna paprabuje złučycca z Aŭstryjaj, kab paśla rabić nastup na ŭschod Eŭropy—hałoŭna na Sawiety.

Słowam, strełу ŭ Afrycy nadta skora mohuć uzarwać eŭrapejskija parachoŭni, dzie ŭsia palityčnaja systema abapiortaja tolki na sile.

Woś-ža, tyja dziaržawy, katorym najbolš strašnaja wajna, z usich sił starajucca paŭstrymać italjanskich fašystaŭ ad pachodu ŭ Afryku, kab nadalej adapchnuć žudaści wajny.

U hetaj sprawie pačała hetymi dniami narady Liha Narodaŭ, jakaja składajecca z pradstaŭnikoŭ „miratworčych“ i wajnu hatowiačych dziaržaŭ.

Nie zważajučy na toje, što Liha ŭžo zusim straciła swoj aŭtorytet u mnohich dziaržaŭ, adnak prypynieńnie ciapierašniaha razhonu italjanskaha dyktatara Musoliniaha pa abisynskaje bahaćcie ŭ Afryku całkom zaležnaje ad stanowišča Francyi z Anhlijaj, bo jany ŭ tawarystwie Sawietaŭ stanowiać woś Lihi Narodaŭ.

Kamintern i S.S.R.R.

Na VII Kanhresie Kaminternu, jaki adbyŭsia ŭ min. m-cy ŭ Maskwie, u wykanaŭčy Kamitet hetaj mižnarodnaj kamunistyčnaj arhanizacyi wybrany miž inšymi tak-ža i dyktatar SSRR Stalin.

Stalin, jak wiedama, zdawoliŭsia adnoj sacyjalistyčnaj dziaržawaj — SSRR, kab u joj prawodzić i ŭkraplać kamunistyčny ład, i dziela hetaha pačaŭ zaklučać sajuzy z buržuaznymi dziaržawami. Eŭrapejskija i amerykanskija dziaržawy zaklučyli dahawory z Sawietami z warunkam, što kamunisty nia buduć u ichnich „buržuaznych“ dziaržawach prawodzić swaje raboty.

Tymčasam, apošni Kanhres Kaminternu wydaŭ rezalucyju rabić u niekatorych dziaržawach rewalucyju, kab hetak prymusić urady tych dziaržaŭ zhadzicca na wiedamy h. zw. maskoŭski ŭschodni dahawor, jaki zaprapanawany kamisaram Litwinawym.

Paśla hetakaj rezalucyi Kaminternu ŭ świecie zawarušylisia kamunisty, a prociŭ hetaj rezalucyi pačali pratestawać dziaržawy: Anhlija, Zł. St. Ameryki, Italija i Łatwija. Swaje pratesty hetyja dziaržawy skirawali da ŭradu SSRR. Sawieckija dyplomaty starajucca tłumačyć, što pastanowy Kaminternu Sawietaŭ nie abawiazujuć.

Słowam, zawarušylisia kamunisty, pačałasia akcyja i prociŭkamunistyčnaja. Da čaho heta dawiadzie — pakaža budučynia.

Wyniki II dziaržaŭnaha pierapisu

Letaś my padawali wyniki II pol. dziaržaŭnaha pierapisu ŭ pawietach Wilenskaha wajawodztwa. Ciapier padajom hety wynik całaha Wilenskaha wajawodztwa.

Woś ža, pawodle padličeńnia Hałoŭnaha Statystyčnaha Uradu, na terytoryi Wilenskaha wajawodztwa zhodna z II-him dziaržaŭnym pierapisam, što adbyŭsia ŭ śniežni 1931 h., biełarusaŭ zapisana — 287.938 asob.

Biełarusy wiedajuć, jak adbywaŭsia hety pierapis nasielnictwa. Ab hetym niamała pisałasia i ŭ „Bieł. Krynicy". Nia dziwa, što hetaki wynik taho pierapisu.

Ale — paciešma siabie—287.938 biełarusaŭ u Wilenskim wajawodztwie—heta ličba zusim narodna świedamych i stojkich Biełarusaŭ.

Roznyja wiestki

Z HAZET.

Maskali ciešacca. Baraćba maskoŭskich balšawikoŭ z biełaruščynaj u Sawieckaj Biełarusi, z biełaruskim adradženskim u jej rucham — ciešyć usich maskaloŭ usiudy, hdzie b jany nie pražywali.

„Русскій Голос" — orhan rasiejskaj čornaj sotni, jaki wychodzić u Lwowie, u Nr 30 sioleta źmiaščaje artykuł p. z. „Борьба с сепаратическими уклонами," u jakim aŭtar wyražaje paciechu z maskoŭskaj balšawickaj palityki apošnich hadoŭ u adnosinach da Biełarusaŭ.

Aŭtar, niechta B. S., napačatku artykułu kaža: „Последния события доказывают, что центральныя совѣтскія власти внимательно относятся к проявлениям внутри СССР національных теченій, прекращая их в корнѣ, поскольку таковыя обнаружывают сепаратистическіе уклоны. Об этом свидѣтельствует постановка вопроса о языкѣ в Сов. Бѣлоруссіи."

Dalej aŭtar wyražaje pačućcio radaści z pryčyny prawiedzienaj balšawikami reformy biełaruskaj hramatyki i ortohrafii u duchu, karysnym dla „единства русскаго народа," i ŭrešcie ćwierdzić, što „СССР не разнится от довоенной Россіи, которая допускала(!?—red.) свободное развитіе трех русскіх (? —red.) народностей, но выступала рѣшительно против проявленія ими сепаратистических тенденцій, направленых на разбитіе національнаго і в дальнѣйшем политическаго цѣльнаго русскаго организма."

Adnym słowam aŭtar biełarusajed ciešycca, što balšawickaja nacyjanalnaja palityka ničym nia rožnicca ad takoj-ža palityki carskaj, što jak adna tak i druhaja maje na mecie nacyjanalnuju i palityčnuju sucelnaść „русскага организма!"

Z POLŠČY.

Pamior zasłužany Rasiejac. 16-ha červienia sioleta pamior na Wałyni Uładzimier Fiodarawič Štejnhiel, zasłužany hramadzki, carkoŭny i palityčny dziejač. Niabožčyk braŭ učaście i ŭ pracach mižnarodnych kanhresaŭ nacyjanalnych mienšaściaŭ.

24.848 rastrat. U praciahu apošniaha hodu na terytoryi ŭsiej Polščy zarehistrawana 24.848 wypadkaŭ rastrat. Ništo sabie! Najbolšy lik rastrat prypadaje na Waršawu i miesty Šlonska.

Tkačy bastujuć. U Łodzi ŭ tekstylnaj akruzie zabastawała 1500 tkačoŭ. Zabastoŭku wyklikała abnižka zarabotnaj płaty.

Sialanskija źjezdy. Apošnimi časami u roznych kutkach Polščy adbylisia haspadarskija źjezdy. Na źjezdach sialanie pastanawili damahacca ad uradu źmieny haspadarskaj dziaržaŭnaj palityki, imienna prytasawańnia padatkaŭ da cenaŭ zbožža, poŭnaj moratoryi (adsročki) ziemlarobskich daŭhoŭ, abnižeńnia pracentnaj stopy ad zarhanizawanych kredytaŭ, interwencyi ŭradu ŭ adnosinach da kartelaŭ, aproč taho—damahańnie budowy zbažowych elewataraŭ i spynieńnia dastaŭki z zahranicy bawoŭny i ryžu.

Z ZAHRANICY.

Sioleta ŭradžaj na ŭsim świecie. Hazety pawiedamlajuć, što na ŭsim świecie sioleta ŭradziła zbožža. U paraŭnańni z minułym hodam, sioleta ŭradžaj značna lepšy.

Narady Egzekutywy Socyjalistyčnaha Internacyjanału pačalisia nadowiačy. Pryniata rad rezalucyjaŭ, pamiž katorymi jość i praciŭ hitleraŭcaŭ i praciŭ italjanskaha napadu na Abisiniju. Sprawa stwareńnia supolnaha frontu socyjalistaŭ z kamunistami dla baraćby suproć fašyzmu adłožana dziela abhawareńnia na nastupnuju sesiju.

Spor pamiž Italijaj i Abisinijaj. Italijanska-abisynski spor stwaryŭ hroznaje pałažeńnie dla suświetnaha miru. Hazety pišuć, što wajna wybuchnie niezadoŭha. Italijanska-abisynskaj sprawaj zacikaŭleny ŭsie dziaržawy, a najbolš Anhlija i Francyja.

Anhlija wyrazna stanuła pa staranie Abisinii, nia dziela pryjaźni, a dzieła abarony swaich u Abisinii intaresaŭ. Nia wiedama, pa čyjej staranie stanie Francyja. Ciapier jana čakaje wyrašeńnia italijska abisynskaha sporu Lihaj Narodaŭ, jakoj sesija ŭžo pačałasia.

Zhinuła karalewa. Belhijskaja karalewa Astrida ŭ wyniku aŭtamabilnaj katastrofy 29 žniŭnia trahična zhinuła. Niabožčyca była dačkoj šwedzkaha kniazia Karła, brata karala Hustawa. Wyšła zamuš za belhijskaha karala Leopolda III u 1926 h. Pa trahičnaj śmierci belhijskaha karala Alberta I, Leopold III i karalewa Astrida ustupili na prastoł 23 lutaha 1934 h.

U suwiazi z śmierciaj karalewy, u Belhii abwieščana nacyjanalnaja žałoba.

Kanferencyja rasiejskich biskupaŭ. Na dzień 10 kastryčnika wyznačana kanferencyja rasiejskich biskupaŭ, što znachodziacca na emihracyi. Kanferencyja maje na mecie carkoŭnaje abjadnańnie rasiejskich hierarchaŭ zahranicaj i ŭstanaŭleńnie adzinaj carkoŭnaj juryzdykcyi.

Aryšty prawasłaŭnych biskupaŭ u SSSR. Aryštawana niekalki prawasłaŭnych biskupaŭ, što naležać da h. zw. Patryjaršaj carkwy, na čale jakoj staić mitrapalit Siarhiej.

Biezrabotnyja nia chočuć pracawać. Na ŭsim świecie ciapier biezrabotnych naličajecca kala 25 miljonaŭ asob. Hetym biezrabotnym dziaržawy pierawažna dajuć pamohi, jakija časta psujuć biezrabotnych, bo pryzwyčajwajuć ich žyć biaz pracy.

U Amierycy, u šmat jakich kantonach, biezrabotnyja admaŭlajucca pracawać u haspadaroŭ — kažuć, što ciažka pracawać a płata małaja, mienšaja ad dziaržaŭnaj pamohi.

Aryšty kamunistaŭ. U Baŭharyi ŭłada wykryła nowuju rewalucyjna-kamunistyčnuju arhanizacyju. Mnoha kamunistaŭ aryštawana.

Z KRAJU.

Koni dla wojska. Pawodle wiestak wilenskaj Ziemlarobskaj Pałaty, uwosieni sioleta adbudziecca kupla koni dla wojska. Kuplać kaniej budzie specyjalnaja kamisija. Koni, jak i ich ułaśniki, musiać adkazywać niekatorym warunkam.

Terminy kupli takija: 3 i 4 kastryčnika — Lida, 7—8 kastryčnika—Widzy, 5 listapada—Lachawičy, 19 listapada — Hłybokaje, 20 listapada—Maładečna, 21 listapada — Bahdanawa, 26 listapada—Wilnia (kalwaryjski plac), 27 listapada—Skrybaŭcy, 28 listapada — Nowajelnia.

Z WILNI.

Śmierć Amili Vilejšysichi. 26.VIII pamiorła wiedamaja i zasłužanaja ŭ Wilni litoŭskaja dziajačka św. p. Amila Vilejšiene (Vilejšysicha), pražyŭšy 74 h. Na pachowiny byli prybyŭšy delehaty z Niez. Litwy.

Пісьмы з вёскі

Сумна, але не безнадзейна.

Стахоўцы, Пастаўскага пав. Кепска каля нас жывецца і сумна глянуць у будучыню. Маладзяж проста дзічэе. А кепска гэта таму, што для моладзі няма сваей роднай арганізацыі, дзе-б яна гадавалася і прасьвячалася. Польскія „кулкі" то ёсьць, але з іх для беларускай моладзі няма карысьці. Газэт выпісываць нашыя людзі яшчэ ня прывыклі; пачытаць то яны часамі й рады, але купіць кніжку яшчэ няма каму.

У цэркву нашая моладзь ня ходзіць. У нашым прыходзе ў Занарачы сядзіць поп маскаль і ад яго ніхто беларускага слова ня чуў; моладзь ня любіць і не шануе папа, а дзеля гэтага і з царкоўным жыцьцём яна зусім незнаёмая. Моладзь нашая надта гоніцца за мяшчанскай модай: дзеўкі бяз пудры й з хаты ня выходзяць.

Ёсьць аднак ужо адзінкі, што гэта ўсё крытыкуюць і на лепшую дарогу наводзяць — гэта тыя, што чытаюць кніжкі і газэты.

Польская школа нашым дзецям мала дае карысьці — ходзяць па чатыры гады й нічога ня ўмеюць. Кепская ў нас мода, што й людзі сталыя граюць у карты з дзецьмі ў бязцэнныя даўнейшыя царскія грошы,—гэтак старэйшыя прывучаюць малодшых да грашовай ігры ў карты. Але знаходзяцца й такія, што за гэта стыдзяць старэйшых і дзецям граць не пазваляюць.

І. П.

Нашая школьная справа.

Сеньківічы, Касаўскага пав. У нас, стараньнем гуртка ТБШ., у 1927—28 школьным годзе, замест адчыненьня беларускай школы, вучыцелька польскай школы вучыла дзяцей і папольску і пабеларуску. Школьныя беларускія падручнікі даваў дзецям гурток Т.Б.Ш.

Пакуль была арганізацыя ТБШ дзейнай—у нашай школе сяк-так вучылі дзяцей і пабеларуску, а як зьліквідавалі гурток ТБШ., то пачала заміраць і ў школе навука ў роднай мове. У прошлым годзе ўжо ў гэтай школе зусім ня было навучаньня пабеларуску.

Рэлігіі праваслаўных дзяцей да прошлага году ва ўсіх каля нас школах навучалі парасейску, а ў 1934—35 школьным годзе пачалі вучыць папольску.

Нашыя дзеці папольску нічога не разумеюць, а дзеля гэтага нічога ў школе не навучаюцца; рэлігіі дзеці ў школе і ад папа такжа не навучаюцца —калі навучаць бацькі пасвоему веры, то так дзеці й ведаюць рэлігію. У польскай школе нашыя дзеці за некалькі гадоў „прыломяцца" толькі да польскага языка — сёе-тое зразумеюць папольску і сяк-так прамовяць некалькі польскіх слоў. Больш у гэткай школе нічога не навучаюцца.

Нашым дзецям патрэбная родная, беларуская школа, бо толькі ў роднай школе дзіця можа зразумець навуку і карысьць яе.

Бацькі! — Нашым абавязкам ёсьць навесьці справу: даведацца, чаму вучыцелька перастала вучыць пабеларуску і дамагацца для сваіх дзяцей школы ў роднай, беларускай мове; трэба так-жа дамагацца, каб і рэлігіі навучалі нашых дзяцей пабеларуску.

Тутэйшы.

Слава! — Сьмерць!

Камуністы зьненавідзелі І. Дварчаніна.

Навáградчына. Не сакрэт, што КПЗБ робіць скрыта—спадцішка камуністычную работу: агітуе, наіўных хлапчукоў уцягвае ў свае сеткі і гэтак робіць камуністычны шум на сяле. Калісь гэткую работу рабіў і Ігнат Дварчанін, калі быў паслом. Ён таксама трымаў за Саветы і за камуністаў, як і цяперашнія камуністычныя агітатары. Яго польскія суды судзілі за гэта і за гэта ён быў пасаджаны ў турму. Тады тутэйшыя камуністы Дварчаніну крычалі — слава! Паехаў Дварчанін у Саветы і там зьненавідзелі яго камуністы—назвалі „нацдэмам." Цяпер тутэйшыя камуністы крычаць— Дварчаніну сьмерць!

А як-жа — гэта праўда! Надовячы ў Наваградчыне зьляцеўшыся падлёткі, якія ачмучаны камуністычнымі агітатарамі, пастанавілі дамагацца, каб у Саветах бальшавікі растралялі Ігната Дварчаніна.

Беларусы, ратуйце сваю моладзь ад камуністычнага чмуту, бо яна зусім зьдзічэе.

Лявон Бартніцкі.

Starostwo Grodzkie
Wileńskie
BR. I—16 Wilno, dn. 29.VIII.1935 r
L. dz.

Do
Pana A. Szutowicza
Wydawcy „Białoruskiej Krynicy"
w Wilnie ul. Zawalna 1—1.

W związku ze wzmianką, jaka ukazała się w „Białoruskiej Krynicy" z dn. 30.VI. 1935 r. Nr. 27/620 na czwartej stronie w dziale: „Korespondencja ze wsi" p. t. „Bywaje i hetak," zawierającą nieprawdziwe wiadomości, na podstawie art. 21 Dekretu prasowego z dn. 7 II.1919 r. (Dz. Praw P. P. Nr. 14, poz. 186), proszę o zamieszczenie poniższego sprostowania:

„Nieprawdą jest, że Kaczanowiczowi Starostwo udzieliło zezwolenia („wytłumaczyli") na budowę domu, natomiast prawdą jest, że nie chcąc narażać Kaczanowicza na straty zaproponowano mu udzielenie zezwolenia na wykończenie domu pod warunkiem przeniesienia tego domu przez Kaczanowicza na własny koszt, gdyby w wyniku rozpoczętej już komasacji wsi działka ta nie przypadła jemu. Kaczanowicz na to się nie zgodził, wobec czego Wydział Powiatowy w Stołpcach, działając w interesie ogółu komasujących się rolników wsi orzekł zniesienie nielegalnie wybudowanego domu i polecił wykonać to Zarządowi Gminnemu w Swierżniu. Prawdą również jest, że Kaczanowicz odpowiadał przed władzami sądowemi za dwukrotne zerwanie pieczęci urzędowych nałożonych na nielegalnie budowany dom."

Starosta Grodzki
T. Wielowieyski

Беларусы павінны чытаць і пашыраць беларускую прэсу:

1. **„Беларуская Крыніца"** XIX год **„Biełaruskaja Krynica"**, выданьня, палітычны, грамадзкі і літаратурны часапіс, выходзіць што тыдзень. Падпіска на год 4 зл., на паўгода — 2 зл. Адрас: Red. „Biełaruskaja Krynica" Wilno, Zawalna 1—1.

2. **„Самапомач"—„Samapomač"**, IV год выданьня, адзіны ў нас беларускі коопэратыўна-гаспадарскі часапіс, выходзіць рэгулярна што месяц. Падпіска на год 3 зл., на паўгода 1.75. Адрас: Red. „Samapomač", Wilno, Połocka 9—4.

3. **„Шлях Моладзі"**, VII-мы год выданьня, часапіс беларускай моладзі, выходзіць рэгулярна што месяц. Падпіска на год 2 зл., на паўгода 1 зл. Адрас: Red. „Šlach Moładzi", Wilno, Zawalna 1—2.

4. **„Chryścijanskaja Dumka"**, 8-my hod wydańnia, biełaruski katalicki časapis, wychodzić rehularna što miesiac. Padpiska na hod 3 zł., na paŭhodu — 1.50 zł. Adras: Red. „Chryścijanskaja Dumka", Wilno, Zawalna 1—2.

5. **„Praleski"**, 1-šy hod wydańnia, biełaruski dziciačy časapis, wychodzić što miesiac. Padpiska na hod 2 zł. Adras: Red: „Praleski", Wilno, Zawalna 1—2.

6. **„Калосьсе"**, 1-шы год выданьня, беларускі літаратурна-навуковы часапіс, выходзіць раз у тры месяцы. Падпіска на год 4 зл. Адрас: Red. „Kałośsie", Wilno, Zawalna 1—2.

Беларуская газэта найтанейшая і найдаступнейшая. Пробныя нумары (апрача „Калосься") на просьбу высылаюцца бясплатна.
Пішэце выразна свае адрасы!

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič